Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

## *Продкаў мова*

*Я да цябе, нібы да маці,*
*Душой хілюся, продкаў мова.*
*Няхай табе заўсёды шчасціць,*
*Каб развівалася ў любові!*

*Твая краса праз пакаленні*
*Перадаецца, маладзее.*
*Нам з глыбіні тваёй сруменіць*
*Святло, пяшчота і надзея.*

*Дык дай жа Божа табе сілы*
*Не заціхаць між нас ніколі,*
*Распрасціраць над намі крылы*
*І мілагучнасцю спатоліць!*

## *Засяваецца жыта...*

*Засяваецца жыта,*
*Каб жыццё красавала.*
*Шмат гадочкаў пражыта,*
*А здаецца, што мала.*

*Бо душа не старэе:*
*Ёй даруецца вечнасць,*
*Сонца свет белы грэе,*
*Каб цвіла чалавечнасць.*

*І таму нам не варта*
*Шкадаваць аб пражытым,*
*Трэба годна і ўпарта*
*Засяваць нівы жытам.*

*Бласлаўляць трэба шчасце*
*І сваё, і людское,*
*І старацца не ўпасці,*
*Берагчы ўсё святое.*

*Дзеля гэтага людзі*
*У свет белы прыходзяць –*
*Промні раначак будзяць,*
*Нівы жыцейка родзяць.*